# Зялёная прамысловасць

У Беларусі, як еўрапейскай краіны, няма іншага выйсця, акрамя як трансфармацыя прамысловай вытворчасці на прынцыпах экалагічнасці, інавацыйнасці і энергаэфектыўнасці.

Большасць буйных дзяржпрадпрыемстваў Беларусі стратныя, выкарыстоўваюць састарэлыя падыходы і абсталяванне, утрымліваюць залішні штат працоўных і канкурэнтныя толькі за кошт таннага расейскага газу. Большую частку займае прадукцыя, ад якой ЕС і іншыя заходнія краіны плануюць поўнасцю адмовіцца або істотна абмежаваць увоз да 2030 года: транспарт з рухавікамі ўнутранага згарання, хімічныя ўгнаенні, прадукты нафтаперапрацоўкі, тавары з матэрыялаў, няздатных для перапрацоўкі,  і іншыя неэкалагічныя тавары.

*- У 2021 г. на прадпрыемствы, якія поўнасцю або часткова належаць дзяржаве, прыпадала 43% занятых у Беларусі і 69% прамысловай вытворчасці краіны.*

*- На ЕС у 2019 г. прыпадала больш за 20% беларускага экспарту, у тым ліку нафтапрадукты, угнаенні, драўніна, металы, транспарт, электроніка.*

### *Чаму неабходна мяняць прамысловую палітыку Беларусі?*

**1. Не распрацаваная нацыянальная стратэгія развіцця прамысловасці** або яе асобных галін, у тым ліку адчувальных з пункту гледжання ўвядзення Механізму трансгранічнага вугляроднага рэгулявання (МТВР / CBAM): дрэваапрацоўка, цэлюлозна-папяровая і хімічная прамысловасць, нафтаперапрацоўка, металургія, вытворчасць мінеральных прадуктаў і электраэнергіі.

*- Беларусь найбольш схільная да ўвядзення МТВР як краіна са 100% разрывам паміж унутранай цаной на выкіды вугляроду і цаной на выкіды ў Сістэме гандлю выкідамі ЕС. Канчатковае спажыванне паліва апрацоўчай прамысловасцю складае каля 32% ад краінавага спажывання, у тым ліку ў сектарах, якія падпадаюць пад МТВР 25%.*
*- Паводле справаздачы UNCTAD для Беларусі пры кошце вугляроднага падатку 88 $ за тону прагназуецца падзенне экспарту ў 2026 г.на 6,8% са зніжэннем даходаў на 200 млн. $. Гэтыя страты з'яўляюцца непасрэднымі і будуць штогод павялічвацца.*

**2. Працягваюць укараняцца "брудныя" і рэсурса- і энергаёмістыя тэхналогіі** (вытворчасць цэменту мокрым метадам, вытворчасць цэлюлозы), слаба развітая цыркулярная эканоміка, адсутнічае стратэгія па абыходжанні з небяспечнымі адходамі. Беларускія прамысловыя тавары не будуць запатрабаваныя ў ЕС з-за неадпаведнасці экалагічным і кліматычным нормам.

**3. Еўрапейскі зялёны курс** (ЕЗК) і новая прамысловая палітыка ЕС **ставяць задачай абезвугляроджванне энергаёмістых галін**. Аналагічныя захады, уведзеныя на беларускіх прадпрыемствах, істотна павялічаць канкурэнтаздольнасць тавараў на сусветным рынку, будуць развіваць даследаванні і інавацыі, ствараць уласную вытворчасць. ЕС залежыць ад імпарту ў шэрагу крытычных галін і мае патрэбу ў надзейных партнёрах.

У Беларусі ёсць патэнцыял для пераходу да больш экалагічнай вытворчасці: выкарыстанне газу замест вугалю, сучасныя нафтаперапрацоўчы комплекс і хімічная прамысловасць, патэнцыял для зялёнай энергетыкі, адукаванае насельніцтва, развіты бізнес і IT-галіна.

*Беларуская ініцыятыва “Больш чыстая і энергаэфектыўная вытворчасць” прасоўвае стварэнне **экапрамысловых паркаў**. Паркі з некалькіх прадпрыемстваў спажываюць спадарожныя рэсурсы, уключаючы адходы ў вытворчасць, выкарыстоўваюць сумесную інфраструктуру: генерацыя энергіі, збор і ачыстка вады, лагістыка, мабільнасць, сэрвісы, навучанне, харчаванне і рэкрэацыйныя зоны для супрацоўнікаў.*

### *Карысць для беларусаў*

Зялёная прамысловасць дазволіць зменшыць забруджванне паветра, вады і глебы, што спрыяльна адаб'ецца на здароўі беларусаў і навакольным асяроддзі. Будуць стварацца новыя працоўныя месцы ў вытворчасці, перапрацоўцы адходаў, экалагічным менеджменце, навуцы і адукацыі. Цыркулярныя бізнес-працэсы дазволяць прадпрыемствам істотна эканоміць на сыравіне, беларуская прадукцыя стане больш рэнтабельнай і запатрабаванай на заходніх рынках, што станоўча паўплывае на дабрабыт рабочых.

## Як зрабіць прамысловасць Беларусі зялёнай?

Неабходнай умовай з'яўляецца лібералізацыя эканомікі і увядзенне рыначных механізмаў кіравання. Беларускія эканамісты падрыхтавалі план прыватызацыі дзяржаўнага сектара, у якім прадугледжана стварэнне індывідуальных планаў для топ-100 прамысловых прадпрыемстваў. Стымуламі для развіцця зялёнай прамысловасці стануць палітыка вугляроднага рэгулявання, развіццё зялёнага фінансавання і ўкараненне прынцыпаў ESG.

*- ESG (Environmental, Social, and Corporate Governance) – экалагічнае, сацыяльнае і карпаратыўнае кіраванне. Справаздачнасць ESG павялічвае ўстойлівасць і інвестыцыйную прывабнасць прадпрыемства, з'яўляецца пропускам на "зялёныя" фондавыя біржы. Прынцыпы ESG стымулююць кампаніі ўкараняць інавацыі, клапаціцца аб навакольным асяроддзі, мясцовых супольнасцях і супрацоўніках.*

| Мэта | Практычная рэалізацыя |
|---|---|
| **1. Дэкарбанізаваць энергаёмістыя галіны** | |
| - Распрацоўка стратэгіі нізкавугляроднага развіцця<br>- Зніжэнне вуглеродаёмістасці тавараў і прадукцыі<br>- Падтрымка ў пераходны перыяд галін і прадпрыемстваў у зоне рызыкі | - Укараніць механізмы вымярэння і кіравання вугляродным следам тавараў і паслуг<br>- Распрацаваць план адаптацыі да ЕЗК<br>- Выкарыстоўваць зялёную энергію, біяпаліва, вадарод<br>- Павышаць энергаэфектыўнасць вытворчасці<br>- Укараніць тэхналогіі ўлоўлівання і захоўвання CO2<br>- Укараняць энергетычную і хімічную газіфікацыю<br>- Мадэрнізаваць тэхналогіі ў бок электрыфікацыі |
| **2. Развіваць цыркулярную эканоміку** | |
| - Увядзенне стандартаў экадызайну, нетаксічнасці, рэмонтаздатнасці, перапрацоўваемасці<br>- Павышэнне рэсурсаэфектыўнасці<br>- Інфармаванне аб магчымасцях цыркулярнай эканомікі | - Стварыць біржу другаснай сыравіны, інтэграваць яе з ЕС<br>- Павялічыць другаснае выкарыстанне і перапрацоўку адходаў<br>- Выпрацоўваць біягаз і энергію з арганічных адходаў<br>- Укараняць цыркулярныя бізнес-мадэлі: прадукт як паслуга, цыркулярныя пастаўкі, аднаўленне рэсурсаў, прадаўжэнне жыццёвага цыкла прадукцыі<br>- Падтрымліваць стварэнне экапрамысловых паркаў<br>- Арганізаваць навучанне, стажыроўкі, абмен досведам для муніцыпальных чыноўнікаў, бізнесоўцаў, навукоўцаў |
| **3. Укараняць чыстыя тэхналогіі** | |
| - Павышэнне экалагічных стандартаў да ўзроўню ЕС<br>- Укараненне ў практыку ESG-ацэнак<br>- Стварэнне спрыяльнага інвестыцыйнага клімату<br>- Падтрымка даследаванняў і інавацый | - Распрацаваць стратэгію развіцця зялёнай эканомікі па галінах і інвестыцыйны план<br>- Развіваць вытворчасць у перспектыўных сектарах:<br>• Біягаз, вадарод, біяпаліва, метан<br>• Электрычны транспарт і сельгастэхніка<br>• Біяпластык і экалагічныя пакункі<br>• Абсталяванне для зялёнай энергетыкі<br>• Рэцыкляваныя матэрыялы<br>• Арганічныя ўгнаенні<br>- Ствараць зборачныя цэхі замежных вытворчасцей<br>- Прыцягваць інвестыцыі ў чыстую вытворчасць<br>- Увесці мараторый на дзяржінвестыцыі ў "брудныя" тэхналогіі |

### *Крыніцы фінансавання рэформы*

Развіццё зялёнай эканомікі забяспечыць зніжэнне выдаткаў на сыравіну і энерганосьбіты, мінімізацыю шкоды ад забруджвання паветра і змены клімату (да 6% ВУП), а таксама садзейнічае росту ВУП за кошт цыркулярнай эканомікі (да 1,2%). Крыніцай дзяржаўных інвестыцый можа стаць правядзенне прыватызацыі дзяржаўнага сектара і Зялёны інвестыцыйны фонд, які фармуецца за кошт сістэмы гандлю квотамі на выкіды, вугляродных і экалагічных падаткаў (каля 260 млн. $ у год). Замежныя інвестыцыі могуць забяспечыць ЕІБ, ЕБРР, СБ.

*Аўтары: Аляксандра Мамаева ў супрацы з беларускім экспертам*
*Падрыхтавана CASE у супрацы з Эканамічнай камандай*
*Офіса Святланы Ціханоўскай пры фінансавай падтрымцы MATRA*